# Эсэ “Чалавек – працаўнік на вайне”

Русан Лізавета Фёдараўна, 16 гадоў

Вясновы месяц май, як ніякі іншы месяц багаты на святы. Але ўсё ж сярод свят адно мы вызначаем асабліва –Дзень Перамогі. І святкуем яго штогод радасна і шчыра. Гэта не выпадкова. У нашай краіне па сапраўднаму няма ніводнай сям’і, якую б вайна не закранула сваім чорным крылом. Хтосьці прайшоў праз цяжкасці партызанскага жыцця, хтосьці не дачакаўся з фронту бацьку і пасля вайны рос сіратой, абдзелены яго любоўю і ласкай… Нехта згубіў у полымі ліхалецця ўсю сям’ю. А хтосьці ваяваў сам, як, напрыклад, цудоўны чалавек, былы старшыня калгаса, жыхар вёскі Браносава, што знаходзіцца ў Турэцкім сельскім Савеце, Саўка Уладзімір Уладзіміравіч. Здаецца, зусім нядаўна, гэты сталы прыгожы мужчына з шчырай усмешкай на твары сардэчна вітаўся з знаёмымі, аднавяскоўцамі… Усім хацелася з ім пагаварыць, даведацца аб жыцці, дакрануцца душой да чалавечай мудрасці і мужнасці…

Уладзімір Уладзіміравіч, нястомны працаўнік, увесь час сваё жыццё дзяліў на дзве часткі: тое, што было да вайны, і тое, што пасля яе. А вайна – гэта як чорная рыска, правал, глыбокі яр, які нельга засыпаць, пра які нельга забыць. Ен добра памятаў, як наступалі немцы, як ляжалі на дарозе дзве маладыя забітыя жанчыны, а каля іх маленькае дзіця – дзяўчынка. “Мы забралі з сабою гэту дзяўчынку,- з боллю ў голасе ўспамінаў Уладзімір Уладзіміравіч, - яна была з намі больш як два тыдні, а потым мы завезлі яе ў медсамбат.”

Дарогі вайны – цяжкія, палітыя крывёй. У 1942 годзе Уладзіміра Уладзіміравіча параніла ў нагу, потым служба ў 177 Любанскай дывізіі, 483 палка. Былы франтавік ізноў жа ўспамінаў: “Першы раз пайшлі мы ў разведку і вярнуліся ні з чым. Быў моцны вецер, непагадзь, і мы заблудзіліся, з цяжкасцю адшукалі сваіх баявых сяброў. А вось наступная аперацыя прайшла з поспехам. На лясной паляне нашым салдатам сустрэлася невялічкая зямлянка. З асцярожнасцю зайшлі туды і ўбачылі 12 нямецкіх сувязных і афіцэра. Іх абяззброілі, прывялі ў свой полк. Невялікае здарэнне вайны. А колькі было такіх здарэнняў за доўгія чатыры гады.

Пасля вайны Уладзімір Уладзіміравіч вярнуўся ў сваю родную вёску. Патрэбна было аднаўляць разбураную гаспадарку, паступова залечваць, хай сабе і невылечныя раны вайны. Дзень Перамогі для сапраўднага абаронца Радзімы Уладзіміра Саўкі, як і для ўсіх ветэранаў, быў заўсёды днём пазбаўлення ад цяжкасцей, голаду, слёз, гора, самае светлае свята на ўсё жыццё.

Мы, сёняшняе пакаленне, часта задумваемся над тым, што колькі б ні прайшло гадоў – і дзесяць, і дваццаць, і сямдзясят пяць – адносіны нашы да Дня Перамогі, да тых, хто падараваў нам гэты радасны дзень, не мяняюцца. У свет прыходзяць і падрастаюць новыя пакаленні, якіх, здаецца, не павінны былі б хваляваць тыя незнаёмыя і далёкія ад іх цяперашняга жыцця жахі. А

яны іх хвалююць. Сённяшнія юнакі і дзяўчаты у Дзень Перамогі разам са старэйшымі ідуць да помнікаў, нясуць кветкі, адчуваюць боль незваротнай страты. Той дзень застаўся навечна ў памяці народа, ён – у геннай памяці кожнага з нас.